# Ім ганарыцца Хоцімшчына

**22 ліпеня спаўняецца 70 гадоў вядомаму беларускаму вучонаму, дыпламату і грамадскаму дзеячу, таленавітаму паэту Леаніду Фёдаравічу Яўменаву.**

Бог і прырода паступілі шчодра і мудра, сабраўшы ў адной асобе столькі іпастасей.

Леанід Яўменаў – доктар філасофскіх навук, прафесар, член-карэспандэнт Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, знакаміты вучоны ў галіне філасофіі, палітыкі, паліталогіі, правоў чалавека і сацыялогіі. Навуковыя інтарэсы Леаніда Фёдаравіча прасціраюцца ў шырокіх межах праблем дыялектыкі палітычнай філасофіі і сучаснай заходнееўрапейскай філасофскай думкі. Ён аўтар больш двухсот навуковых і навукова-публіцыстычных работ, сямі манаграфій, падрыхтаваў 8 кандыдатаў і двух дактароў навук. Асаблівае месца сярод навуковых публікацый апошніх гадоў займае яго фундаментальная праца "Международная идеология прав человека: проблемы – решения" ("Опыт философского исследования", Минск, 2000, 450 стр.).

Леанід Яўменаў – прызнаны міжнародны дыпламат, грамадскі і дзяржаўны дзеяч. У 1986-1988 гг. ён прадстаўляў БССР у Камісіі ААН па правах чалавека. У 1987 годзе выбіраўся старшынёй гэтай Камісіі, цяпер віцэ-прэзідэнт Беларускай Асацыяцыі садзейнічання ААН, старшыня навукова-экспертнага савета Беларускай секцыі па правах чалавека, прымаў удзел



Паэзія Яўменава шчырая, па-грамадзянску актыўная, у ёй філасофскі роздум над праблемамі жыцця чалавека і грамадства, шмат каларытных жанравых сцэнак з жыцця. Галоўнае ў ёй – тэма Радзімы, хараство роднай зямлі, дачыненні жыцця, чалавека і прыроды, чалавека і грамадства.

Другі бок паэтычнага таленту Леаніда Яўменава – пераклады. Перакладае ён у асноўным сучасную французскую і франкамоўную паэзію Канады. Ёсць у яго таксама таленавітыя пераклады паэтаў Злучаных Штатаў Амерыкі. Выступае паэт Яўменаў таксама з артыкуламі па пытаннях айчыннай і за-

(1986-1988 гг.) у распрацоўцы Міжнароднай канвенцыі аб правах дзіцяці, удзельнічаў у пасяджэннях Генеральнай Асамблеі ААН, Генеральнай Канферэнцыі ЮНЕСКА, шматлікіх міжнародных форумах па правах чалавека. Л.Ф. Яўменаў скончыў аддзяленне філасофіі гістарычнага факультэта БДУ, Акадэмію грамадскіх навук пры ЦК КПСС, вучыўся ў Сарбоне (Францыя), працаваў загадчыкам кафедры БДУ, загадчыкам сектара Інстытута філасофіі і права АН БССР, вядучым спецыялістам аддзела філасофіі Дэпартамента сацыяльных, гуманітарных навук і культуры ЮНЕСКА. Каля 20 гадоў узначальваў аддзел навуковай інфармацыі па гуманітарных навуках НАН Беларусі. Пасля выхаду на пенсію працаваў навуковым супрацоўнікам гэтага аддзела.

Леанід Яўменаў – таленавіты паэт, сябра Беларускага Саюза пісьменнікаў. Першыя вершы былі надрукаваны ў 1949 годзе ў бабруйскай раённай газеце. Першы зборнік – "Чужая планета" выйшаў у 1980 годзе, другі – "Блізкія далі" – у 1983 і, нарэшце, у 1997 годзе паэт выдаў кнігу паэзіі "Існасць".

...межнай літаратур.

І напрыканцы нельга не сказаць некалькі слоў пра Яўменава як грамадзяніна і чалавека. Перш за ўсё трэба адзначыць яго незвычайную чароўную абаяльнасць, душэўную дабрыню і спагаду. Ён і сам шчыра хінецца да людзей і як бы магнітам прыцягвае іх да сябе.

Словам, з усіх бакоў Леанід Фёдаравіч зайздросна прыгожы чалавек. Што датычыцца працавітасці, то аб гэтым гаворыць прыведзены вышэй пералік публікацый. Рэдкасны талент! Здаецца ён увасабляе ў сябе лепшыя рысы беларускага народа. Ім па праву могуць ганарыцца жыхары Хоцімшчыны і кожны беларус.

Хочацца пажадаць гэтаму ўсебакова прыгожаму, мудраму і мужнаму чалавеку доўгага веку пры добрым здароўі, каб і надалей плённа працавалася як у навуцы, так і ў паэзіі, каб была радасць жыцця, каб ніколі не пакідала светлае і святое пачуццё ўзыходзячага сонца.

**Шчыра, ўсім сэрцам ад імя ўсіх сяброў і паплечнікаў журналіст В. ВІЛЬТОЎСКІ.**

**Вільтоўскі, В.** Ім ганарыцца Хоцімшчына : [пра Леаніда Яўменава, беларускага вучонага, паэта-земляка] / В.Вільтоўскі // Шлях Кастрычніка. — 2002. — №56